[1] Беларуская граматыка. Мн., 1986. Ч. 2. С. 218.

[2] Валгина Н. С., Розенталь Д. Э. Современный русский язык. М., 1987. С. 343.

[3] Гвоздев А. Н. Современный русский литературный язык. М., 1973. Ч. 2. С. 91.

[4] Шахматов А. А. Синтаксис русского языка. Л., 1941. С. 30.

[5] Там жа. С. 50.

[6] Копнин Н. В. // Мышление и язык. М., 1957. С. 338—339.

[7] Арват Н. Н. О природе безличных предложений. Черновцы, 1960. С. 10—11.

[8] Юдин А. А. // Уч. зап. Кемерово, 1956. Вып. 1. С. 173.

[9] Сиротинина О. Б. Лекции по синтаксису русского языка. М., 1980. С. 79.

[10] Там жа. С. 54, 74.

[11] Ардентов Б. П. Основы русской грамматики. Кишинев, 1962. С. 47.

[12] Копнин П. В. // Мышление и язык. М., 1957. С. 338.

[13] Гиро-Вебер М. // Вопросы языкознания. 1979. № 6. С. 63, 66.

[14] Мухин А. М. Структура предложений и их модели. Л., 1968. С. 134.

[15] Виноградов В. В. Русский язык. М.; Л., 1947. С. 461.

[16] Гл.: Бабайцева В. В. Односоставные предложения в современном русском языке. М., 1968. С. 55.

[17] Кириллова В. А. // Исследования по современному русскому языку. М., 1970. С. 91.

[18] Ломтев Т. П. Основы синтаксиса современного русского языка. М., 1956. С. 130.

[19] Некрасов Н. П. О значении форм русского глагола. Спб., 1865. С. 107.

[20] Ломтев Т. П. Грамматика белорусского языка. М., 1956. С. 205.

[21] Пешковский А. М. Русский синтаксис в научном освещении. М., 1956. С. 369.

[22] Истрина Е. С. // Уч. зап. Казах. гос. ун-та. 1946. Т. 11. С. 32.

[23] Бабайцева В. В. Односоставные предложения в современном русском языке. М., 1968. С. 129.

[24] Юрченко В. С. Простое предложение в современном русском языке. Саратов, 1972. С. 186.

[25] Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Сінтаксіс. Мн., 1959. С. 133.

Д. А. АРЛОЎСКІ

# СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ АБСТРАКТНАЙ ЛЕКСІКІ

Тэматычную групу абстрактных назоўнікаў можна разглядаць, зыходзячы з выпрацаванай у сучаснай лінгвістыцы канцэпцыі, як лексічную падсістэму. Пры гэтым сістэма ўяўляецца нам у выглядзе сукупнасці элементаў, што маюць унутраныя сувязі, якія ператвараюць гэту сукупнасць у цэласны аб'ект, якасці якога не зводзяцца да сумы якасцей яго кампанентаў.

Словы з абстрактным значэннем займаюць важнае месца ў лексічнай сістэме мовы. Менавіта абстрактная лексіка адлюстроўвае ўзровень інтэлектуальнасці мовы, яе здольнасць перадаваць складаныя (тэарэтычныя, навуковыя) паняцці.

Абстрактная лексіка беларускай мовы вывучана вельмі слаба. Некаторыя пытанні, звязаныя з развіццём гэтага лексічнага пласта, закрануты ў артыкулах У. А. Бобрык, Т. І. Салавянчык і некаторых іншых[1]. Але пакуль што няма адназначнага вырашэння пытанняў аб складзе абстрактнай лексікі, яе структурна-семантычных асаблівасцях і заканамернасцях ужывання. Больш таго, да нашага часу наогул не вызначаны дастаткова выразныя крытэрыі размежавання канкрэтнай і абстрактнай лексікі, што, безумоўна, ускладняе вылучэнне адпаведных слоў з агульнага лексічнага складу мовы.

Абстрактнасць як семантычная катэгорыя ўласціва ў рознай ступені словам усіх часцін мовы. Звычайна пад абстрактным разумеюць тое, што не нясе ў сабе матэрыяльнага напаўнення. Згодна з гэтым, да абстрактных назоўнікаў можна аднесці тыя, што абазначаюць разнастайныя ўласцівасці, дзеянні, працэсы, якасці, пачуцці, стан, паняцці меры, памеру і іншыя з'явы аб'ектыўнай рэчаіснасці, што, як правіла, не ўспрымаюцца органамі пачуццяў.

Агульнай фармальнай рысай абстрактных назоўнікаў з'яўляецца тое, што яны, у пераважнай большасці, ужываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку, напрыклад: *аб'ектыўнасць, даўгавечнасць, магічнасць, перакана-ўчасць, тактоўнасць* і да т. п. Некаторыя з іх могуць ужывацца ў множналікавай форме: *абавязак, выпадак, довад, перамога* і да т. п., аднак гэта звычайна адбываецца тады, калі значэнне абстрактнага назоўніка ў пэўнай ступені канкрэтызуецца. Яшчэ адным фармальным паказчыкам абстрактных назоўнікаў з'яўляецца іх неспалучальнасць з лічэбнікамі (у абсалютнай большасці выпадкаў). Нельга, напрыклад, прызнаць нарматыўнымі словазлучэнні тыпу *сёмая абсалютнасць, тры душэўнасці, пяць раптоўнасцей* і г. д.

Пласт абстрактнай лексікі фарміраваўся на працягу многіх стагоддзяў. У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» намі выяўлена каля 3500 назоўнікаў, якія можна аднесці да катэгорыі абстрактных. Гэта прыблізна 4 % агульнай колькасці, змешчаных у ім слоў.

У вялікай колькасці выпадкаў мяжу паміж абстрактным і канкрэтным можна правесці, толькі калі разглядаць слова ў кантэксце. Разгледзім, напрыклад, слова *абавязак*. Як вядома, гэта тое, што хто-небудзь павінен выконваць у адпаведнасці з пэўнымі патрабаваннямі. Параўн. наступныя сказы: *Прыбыўшы ў ваш горад, я палічыў абавязкам засведчыць вам маю пашану* (К. Крапіва). *Свае старшынскія абавязкі Люба здала Міхалу* (А. Васілевіч). Як бачна з прыкладаў, у другім сказе гэта слова мае канкрэтную напоўненасць, таму ў даным выпадку яно ўжываецца ў множналікавай форме.

Ёсць шэраг назоўнікаў, што ляжаць на мяжы паміж абстрактнымі і канкрэтнымі, і менавіта іх наяўнасць не дазваляе рэзка размяжаваць назоўнікі на гэтыя два класы. Гэта ў першую чаргу адносіцца да тых полісемічных назоўнікаў, што побач з абстрактным маюць і канкрэтнае значэнне, прычым наяўнасць у адным слове абстрактных і канкрэтных значэнняў можна растлумачыць толькі з гістарычнага пункту гледжання. Разгледзім, напрыклад, лексему *вяршыня*. У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» падаюцца два значэнні гэтага слова: 1. Самы высокі пункт, верхняя частка чаго-н. *Празрыста-зялёнымі рабіліся вяршыні бяроз у блізкім парку* (М. Лынькоў). 2. Вышэйшая ступень чаго-н. *Вяршыня творчасці пісьменніка. Вяршыня славы.* Відавочна, што першае значэнне слова суаднесена з пэўнай рэаліяй, а значыць, канкрэтызавана, другое ж значэнне не мае такіх суадносін, а значыць, яно абстрактнае.

Нам здаецца мэтазгодным пры семантычнай класіфікацыі абстрактных назоўнікаў выкарыстаць палявы падыход, які патрабуе ўлічваць наступныя фактары: 1) агульнасць семантыка-сінтаксічнай функцыі разнародных сродкаў выражэння моўнай катэгорыі; 2) узаемасувязь мноства адзінак розных узроўняў мовы — кампанентаў поля; 3) структуру, асноўнымі праяўленнямі якой з'яўляюцца: а) чляненне цэнтр — перыферыя, б) паступовыя пераходы, частковыя перасячэнні[2]. Для нас найбольш істотнай з'яўляецца фактар проціпастаўлення цэнтр — перыферыя.

З вылучаных у лінгвістычнай літаратуры фактараў гэтага проціпастаўлення для вывучэння семантычных палёў і, у прыватнасці, поля абстрактнасці, мы прапануем выкарыстаць наступныя:

«1. Уласцівасць кампактнасці, канцэнтрацыі, прымет, якія характэрны для дадзенай сукупнасці (цэнтр), — уласцівасць дыфузнасці, разрэджанасці такіх прымет (перыферыя).

2. Найбольшая спецыялізаванасць пэўнага сродку або сродкаў для выражэння значэння лексіка-граматычнай катэгорыі (цэнтр) — меншая ступень спецыялізаванасці, пабочная роля ў рэалізацыі дадзенага значэння (перыферыя)»[3].

Пры выбары абстрактных назоўнікаў з агульнага складу лексем і іх цэнтральнай часткі (ядра) мы ўлічвалі як семантычныя асаблівасці пералічаных падгруп слоў (абазначэнне адцягненых уласцівасцей, якасцей, пачуццяў, стану і г. д.), так і фармальна-граматычныя. Да ліку апошніх перш за ўсё адносяцца неўжывальнасць у множналікавай форме і неспалучальнасць з лічэбнікамі.

Паводле значэння выяўленыя намі назоўнікі вельмі разнастайныя. Прытрымліваючыся вышэйзгаданых крытэрыяў вылучэння, да ядра абстрактных назоўнікаў можна аднесці назоўнікі некалькіх семантычных падгруп. У колькасных адносінах назоўнікі гэтых падгруп істотна адрозніваюцца. Пераважная большасць назоўнікаў, што адносяцца да ядра поля абстрактнасці, аб'яднана ў першай падгрупе. Астатнія назоўнікі, што аб'яднаны ў падгрупы са значэннямі адцягненых паняццяў працэсу, пачуцця, размеркаваны прыблізна раўнамерна.

1. Назоўнікі са значэннем адцягненага паняцця ўласцівасці, якасці: *абаяльнасць, адкрытасць, бясформенасць, вертыкальнасць, гарманічнасць, дакладнасць, дасведчанасць, жадлівасць, жыватворнасць, запаволенасць, значымасць, інертнасць, лаканічнасць, мужнасць, пахучасць, пашыранасць, руціннасць, спеласць, умеранасць, чароўнасць, шчаслівасць, экзатычнасць, ядранасць* і да т. п.

2. Назоўнікі са значэннем адцягненага паняцця працэсу, дзеяння: *абнадзейванне, бытаванне, гасцяванне, непрыманне, пакаранне, самакіраванне, узнікненне, яснабачанне* і да т. п. Сюды ж уваходзяць і назоўнікі двух асобных семантычных разрадаў: а) што абазначаюць паводзіны: *адшчапенства, буянства, вераломства, гультайства, дзікунства, зухаватасць, каварства, неслухмянства, панікёрства, рвацтва, сібарыцтва, угодніцтва* і да т. п.; б) з агульнай семантыкай пэўнага віду дзейнасці: *аматарства, байбацтва, грабёжніцтва, жульніцтва, пасрэдніцтва, сабатажніцтва, філантропія, шэфства, эпігонства* і да т. п.

3. Назоўнікі, што абазначаюць пачуцці: *антыпатыя, боязь, гнеў, журба, злосць, любоў, млосць, нялоўкасць, прыемнасць, радасць, саромата, туга, удзячнасць, шкадоба* і да т. п. Да іх далучаюцца назоўнікі са значэннем адносін: *братэрства, варожасць, недавер'е, панібрацтва, раўнадушша, сваяцтва, халатнасць, чуласць* і да т. п.

Словам пералічаных вышэй падгруп уласцівы асноўныя прыметы проціпастаўлення цэнтр — перыферыя. У прыватнасці, кампактнасць, канцэнтрацыя адзнак дадзенай сукупнасці выражаецца ў спалучэнні як семантычных, так і фармальных паказчыкаў абстрактнасці лексікі. Найбольшая спецыялізаванасць гэтых слоў праяўляецца ў тым, што яны звычайна маюць толькі абстрактнае значэнне, у адрозненне ад тых мнагазначных слоў, што маюць як абстрактнае, так і канкрэтнае значэнні. Наступныя падгрупы аб'ядноўваюць словы, якія ляжаць на сумежжы паміж ядром і перыферыяй абстрактных назоўнікаў.

1. Назоўнікі са значэннем адцягненага дзеяння. Сярод іх вылучаецца некалькі семантычных падгруп: а) назоўнікі са значэннем фізічнага дзеяння: *абрабаванне, беганне, выкраданне, забойства, змаганне, наведванне* і да т. п.; б) назвы пэўных псіхічных працэсаў: *абагаўленне, выдумванне, гіпнатызаванне, думанне, нерванне, раўнаванне, фантазіраванне* і да т. п.; в) назвы ірэальных дзеянняў: *абуджэнне, адміранне, ажыўленне, ператварэнне, пераўвасабленне, увасабленне, уваскрэсенне* і да т. п.; г) назвы пэўных інтэлектуальных дзеянняў: *абмеркаванне, выкладанне, даказванне, навучанне, паясненне* і да т. п.

2. Назоўнікі са значэннем стану: *азлабленне, бяспамяцтва, вар'яцтва, галеча, задумлівасць, млявасць, недамаганне, пакутніцтва, раз'юшанасць, санлівасць, тамленне, узвінчанасць, хаос, цэласнасць, шалёнасць, экстаз* і да т. п.

3. Назоўнікі з памеравым значэннем (адлегласць, мера, велічыня, колькасць): *абсяг, аграмада, адцінак, безліч, высь, грамада, далеч, норма, прастора, працягласць, разлегласць, шырыня* і да т. п.

4. Назоўнікі са значэннем часавага прамежку: *адвечнасць, будучыня, вокамгненне, даўнасць, імгненне, маладосць, прошласць, старасць, час, юнацтва* і да т. п.

Уласцівасць канцэнтрацыі адзнак дадзенай сукупнасці ў словах блоку выражаецца непаслядоўна: пры наяўнасці семантычных паказчыкаў адзначаецца непаслядоўнасць у выражэнні фармальных прымет, што знаходзіць сваё адлюстраванне ва ўжыванні некаторых назоўнікаў у множналікавай форме і іх спалучальнасці з лічэбнікамі. Пэўная спецы-

ялізаванасць гэтых назоўнікаў для выражэння значэння абстрактнасці выражаецца ў тым, што яны нясуць толькі абстрактнае значэнне у адрозненне ад вялікай колькасці назоўнікаў наступнага блока. Ён уключае падгрупы, якія па сваіх адзнаках падпадаюць пад паняцце перыферыі.

1. Назоўнікі, што абазначаюць розныя культавыя паняцці. Сюды ўваходзяць назвы звышнатуральных істот, а таксама рытуалаў і абрадаў: *абрад, анёл, бажаство, бог, д'ябал, закляцце, лясун, магія, нячысцік* і да т. п.

2. Назоўнікі, што абазначаюць уяўленні грамадства аб дабры і зле, а таксама ўвасабляюць у сабе маральна-этычныя нормы народа і яго адносіны да жыцця: *бясслаўе, героіка, грэх, загуба, заслуга, злыбеда, ілжа, ісціна, краса, крыўда, мараль, мярзота, пашана, прыгоства, хвала, чэсць* і да т. п.

3. Назоўнікі з агульнай семантыкай разумовых паняццяў: *вопыт, замысел, інтэлект, клёк, меркаванне, розум, розумазаключэнне, талент, фантазія* і да т. п.

4. Назоўнікі, што абазначаюць з'явы, у тым ліку якія ўспрымаюцца органамі пачуццяў: *адсвет, вецер, водар, водгалас, водгук, гром, змрок, кур'ёз, міраж, мода, навіна, цуда* і да т. п.

5. Назоўнікі з грамадска-палітычнай семантыкай: *агрэсія, анархія, гегемонія, дэмагогія, інтэрнацыяналізм, народаўладдзе, светапогляд, улада* і да т. п.

6. Назоўнікі з навукова-тэрміналагічнай семантыкай: *абстракцыя, асвета, генезіс, існасць, канцэпцыя, метад, праблема, прынцып, рэзультат, сутнасць, тэндэнцыя, фактар* і да т. п.

Да перыферыі пералічаныя падгрупы мы аднеслі таму, што для іх уласціва разрэджанасць, дыфузнасць прымет, якія характарызуюць усю сукупнасць абстрактных назоўнікаў. Пераважная большасць назоўнікаў перыферыйных падгруп ужываецца ў множналікавай форме і спалучаецца з лічэбнікамі. Для іх таксама характэрна меншая ступень спецыялізаванасці ў рэалізацыі дадзенага значэння з-за наяўнасці побач з абстрактным канкрэтнага значэння.

Такім чынам, да цэнтра лексіка-семантычнага поля абстрактнасці можна аднесці назоўнікі са значэннямі адцягненага паняцця ўласцівасці, якасці, працэсу, дзеяння, пачуцця, якія поўнасцю адпавядаюць вышэйназваным крытэрыям вылучэння. Асобныя падгрупы (назоўнікі са значэннямі адцягненага дзеяння, стану, памеру, часу) адносяцца да цэнтра часткова, паколькі не ва ўсіх пазіцыях яны падпадаюць пад класіфікацыю (асобныя з іх могуць ужывацца ў множналікавай форме або спалучаюцца з лічэбнікамі). Некаторыя падгрупы аб'ядноўваюць словы, якія знаходзяцца на перыферыі лексіка-семантычнага поля абстрактнасці, напрыклад, такія, як назоўнікі, што абазначаюць культавыя паняцці, пэўныя з'явы і інш.

Такім чынам, распаўсюджанае ў літаратуры аднясенне да абстрактных назоўнікаў тых, якія не маюць канкрэтна-матэрыяльнага зместу, абазначаюць адцягненыя ўласцівасці, якасці, дзеянні, працэсы, пачуцці, стан, паняцці меры, памеру, колькасці і іншыя з'явы, што не маюць канкрэтнага ўвасаблення ў аб'ектыўнай рэчаіснасці, ужываюцца звычайна толькі ў форме адзіночнага ліку і не спалучаюцца з лічэбнікамі, можна аднесці цалкам толькі да цэнтральных кампанентаў лексіка-семантычнага поля абстрактнасці.

[1] Гл.: Б о б р ы к У. А. // Беларуская лінгвістыка. 1989. Вып. 22; С а л а в я н ч ы к Т. І. // Беларуская лінгвістыка. 1986. Вып. 30.

[2] А н т а н ю к Л. А. Станавыя значэнні сумеснасці і ўзаемнасці ў беларускай мове. Мн., 1981. С. 26.

[3] Там жа. С. 28, 29, 30.